# Цырымонія ўручэння сертыфікатаў удзельнікам праекта Huawei «Зярняты будучыні» адбылася ў рамках ТІБО-2019 у Мінску

10 красавіка 2019 года ў рамках XXVI Міжнароднай спецыялізаванай выставы "ТІБО-2019", якая праходзіць у Мінску, адбылася цырымонія ўручэння сертыфікатаў удзельнікам праекту "Зярняты будучыні".

На цырымоніі прысутнічалі Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Канстанцін Шульган, першы намеснік Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Ірына Старавойтава, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі Андрэй Зяневіч і віцэ-прэзідэнт Еўразійскай рэгіёну кампаніі Huawei Хоу Тао.
Канстанцін Шульган уручыў сертыфікаты дзесяці таленавітым беларускім студэнтам-удзельнікам праекту, якія 12 красавіка адпраўяцца на навучанне ў Кітай.
«Зярняты будучыні» - гэта глабальны праект, нацэлены на навучанне таленавітай моладзі па спецыяльнасцях у галіне ІКТ. У ходзе двухтыднёвага тура ў Кітай студэнты маюць магчымасць вывучыць кітайскую культуру, наведаць штаб-кватэру кампаніі Huawei, азнаёміцца з найноўшымі тэхнічнымі дасягненнямі і рашэннямі кампаніі.

Праект стартаваў у Беларусі ў 2015 годзе. Усяго за 5 гадоў яго існавання навучанне ў Кітаі прайшлі 80 беларускіх студэнтаў. Яшчэ 1000 прадстаўнікоў таленавітай моладзі філіял кампаніі Huawei навучыў ў Мінску.

---

**Source URL:** *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/10-04-2019-4385*